«Іскра» пра перамяшчэнне войск і тэхнікі праціўніка, размяшчэнне аэрадромаў, абарончых збудаванняў і складоў, пра колькасць і ўзбраенне ням. гарнізонаў, выяўлялі варожую агентуру, дапамагалі партызанам зброяй і медыкаментамі, выводзілі са строю тэлефоннатэлеграфную сувязь праціўніка. Члены арг-цыі падарвалі і спалілі 30 аўтамашын з ваен. і інш. грузамі ворага. 18.5.1944 падпольшчыца М. Ф. Шаўчук учыніла выбух у афіцэрскай сталовай, у выніку якога забіта і паранена некалькі гітлераўцаў. Летам 1944 члены арг-цыі аказалі вял. дапамогу разведкай наступаючым часцям Чырв. Арміі пры вызваленні Брэста, Кобрына і інш. населеных пунктаў вобласці. *Л. В. Аржаева.*

**БРЭСЦКАЯ ЖАНОЧАЯ ГІМНАЗІЯ**, сярэдняя агульнаадук. навучальная ўстанова ў 1904—15. Заснавана 1.7.1904 у Брэсце. Складалася з 6 асноўных і падрыхтоўчага класаў. У 1905 адкрыты 7-ы, у 1907 — 8-ы дадатковы пед. клас. У пач. 1911/12 навуч. года адкрыты паралельныя 3-і і 6-ы класы. Колькасць навучэнцаў вагалася ад 400—500 у 1906—07 да 340 у 1915. Вывучаліся рус., франц., ням., польская



Будынак Брэсцкай жаночай гімназіі. Пачатак 20 ст.

мовы, Закон Божы, гісторыя, матэматыка, фізіка, чыстапісанне, маляванне, геаграфія, рукадзелле, славеснасць, гігіена і інш. Плата за навучанне ў падрыхтоўчым класе складала каля 60 руб. у год, у 1—7-м класах — 75 руб., у 8-м — 100 руб. Дадатковая плата бралася за навучанне лац. мове (10 руб.), догматам іудзейскай веры (4 руб.), танцам (4 руб. ў год). На ўтрыманне гімназіі з дзярж. казны, органаў мясцовага гар. самакіравання і збору за навучанне выдаткоўвалася ў год (у залежнасці ад колькасці навучэнак) ад 20 да 40 тыс. руб.

*Літ.:* Памятная кннжка Внленского учебного округа за 1907—08 учебный год. Внльна, 1907; Памятная кннжка Виленского учебного округа на 1915 г. Вильна, 1915. *М. М. Забаўс*

**БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ**, комплекс абарончых збудаванняў 19 — пач. 20 ст. г. *Брэсце* (Брэст-Літоўску). Пабудава як частка сістэмы ўмацаванняў на З Расійскай імперыі. Размешчана на 4 астравах, утвораных рэкамі Зах. Буг, Мухавец, іх рукавамі і сістэмай канала Будавалася паводле праекта (зацвердж ны імператарам Мікалаем I у 1830) генералаў Малецкага і К. І. Оперма палк. А. І. Фельдмана. У 1832 на шэйшы нагляд за буд-вам крэпасці бы ускладзены на ген.-фельдмаршала Ф. І. Паскевіча. 6.6.1833 пачаты масавыя земляныя работы. У сувязі з пабудовай крэпасці г. Брэст-Літоўск перанесены на 3 км на У. Калі земляныя работы ў асноўным закончыліся, 1.6.1836 адбылася закладка першага каменя, у які бы замураваны бронзавая дошка з памятным надпісам і шкатулка з манетамі. 26.4.1842 Б. к. пачала дзейнічаць як крэпасць 1-га класа. Абарончая сістэма яе (агульная пл. 4 км$^2$) падзялялася Зах. Бугам і Мухаўцом на ўмацава Цэнтральнае (Цытадэль), Валынс (Паўднёвае), Цярэспальскае (Зах няе), Кобрынскае (Паўночнае). Ц дэль размешчана на востраве, на мест

БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ

